Юлія ДАВЫДЗІК
Газета «Культура»

## ХТО «МЯШОК РАДАСЦІ АДКРЫЎ, ВАЎКУ ПАШЧУ ЗАШЧАПІЎ»

Шляхі адраджэння і ўвядзення ў сучасны соцыум нематэрыяльнай культурнай спадчыны народа шукаюць сёння спецыялісты ў сферы народнай культуры і шматлікія аматары. У Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, да прыкладу, іх бачаць у арганізацыі свят «Сонечнага крыжа», дый і ў жыцці важна прытрымлівацца спрадвечнага народнага календара. Мы ўжо вялі размову пра тое, што адраджэнне народных традыцый у горадзе і на сяле — рэчы досыць розныя. На вёсцы ёсць магчымасць адраджаць аўтэнтычныя народныя формы. А ў вялікім горадзе і тыя ж святы сонечнага крыжа — больш абагульненыя. «Ну і што з таго? — адказваюць гарадскія аматары традыцыйнай культуры. Усе мы — дзеці свайго народа, ды і дзяды, бацькі большасці мінчан — вяскоўцы. Нават і абагульненыя формы правядзення свят, але ва ўмовах, па магчымасці набліжаных да прыродных, ды яшчэ пры ўдзеле лепшых мастацкіх калектываў аўтэнтычнага накірунку, будзяць у кожным з нас пачуццё сапраўднай еднасці з гэтай зямлёй, нагадваюць, хто мы і адкуль». Лозунг гарадскіх аматараў нематэрыяльнай культурнай спадчыны: «Аўтэнтыка адраджае маю аўтэнтычнасць».



Сваімі ўражаннямі аб правядзенні ў цэнтры сталіцы чарговага – юраўскага – свята дзеліцца наша чытачка.

— Калі я даведалася, што ў сталічным дзіцячым парку імя Максіма Горкага ладзіцца народнае абрадавае свята ў гонар святога Юрыя — заступніка селяніна, абаронцы свойскай жывёлы і сялянскай нівы, дык проста закарцела паглядзець, як гэта можа выглядаць. Бо на Юр'я (праваслаўныя вернікі адзначаюць гэтае свята 6 мая) сяляне з песнямі і ахвярнымі стравамі выходзілі аглядаць свае зарунелыя палеткі. З гэтым днём быў звязаны і першы выпас хатняй жывёлы. А ў цэнтры Мінска, пагадзіцеся, ні поля, ні каровак...

Дарэчы, адным з пытанняў «круглага стала», у рамках якога праходзіла гэтае мерапрыемства, якраз і была адаптацыя народных сялянскіх святаў да гарадскіх умоў.

Репозиторий БГУКИ

Арганізатары «круглага стала» — Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў і Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі. Агульная тэма «круглага стала» акрэслівалася так: «Падрыхтоўка і правядзенне свят і фестываляў: пытанні дакументальнай асновы мастацкай творчасці». Удзел у абмеркаванні бралі вядучыя спецыялісты сталіцы і рэгіёнаў. Падзяліліся вопытам нават супрацоўнікі Цэнтра этнічнай культуры з Вільнюса. Галоўны каардынатар гэтага цэнтра Індрэ Чэснакаўскайтэ распавяла і паказала на відэа, як ладзяцца народныя святы ў літоўскай сталіцы. Яны яркія і запамінальныя. Усё арганізавана так, што кожны ахвотны мае магчымасць у любы момант далучыцца да святочнай працэсіі. Каб было больш цікава, сімвалічныя абрадавыя дзеянні спалучаюцца з забаўляльнымі. Напрыклад, у дзень веснавога раўнадзенства праходзіць фестываль вогненных скульптур. З саломы робяць постаці розных міфалагічных істот, якія потым спальваюць пад феерверк.

Не менш цікава прайшло свята Юр'я ў Мінску. Урачыстыя гукі дуды спынілі людскую мітусню і расставілі ўсіх па сваіх месцах. Уздоўж сцяжынкі каля малой сцэны парка размясціліся фальклорныя гурты «Верас», «Ветах», «Гронка» Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, ансамбль «Вяснянка» Чурылавіцкага СДК Мінскага раёна, гурт «Этна-NHS» музычнага вучылішча імя Глінкі і групы спецыялізацыі «этнафоназнаўства» БДУ культуры і мастацтваў. З узгорка на ўзгорак пераляталі песні, што ўслаўлялі Святога Юрыя. Калісьці з гэтымі песнямі тройчы абыходзілі жывёлу перад першым выганам у поле на «юраўскую расу», якой у народных вераваннях надавалася цудадзейная моц. У песнях святога прасілі аберагчы кароўку ад ваўкоў, павялічыць надой і даць добры прыплод. Нечакана на сцяжынку выбеглі два гарачыя кані, скараючы ўсіх сваімі прыгожымі постацямі. Яны, як мне растлумачылі, сімвалізавалі статак. У народзе лічылася, што Юрый замыкае ваўкам раты, і конскі статак з гэтага дня не рызыкуе стаць ахвярай драпежнікаў.

Пасля песень-заклікаў усе гурты, зноў жа пад гукі дуды, рушылі на паляну па другі бок сцэны. Паляна сімвалічна ўяўлялася жытнёвым полем. Пачалося ўшанаванне Юрыя-земляроба, спрыяльніка росту азімых. Удзельнікі свята сталі ў круг. І кожны гурт па чарзе выконваў сваю песню «на добры ўраджай». Тым часам з гурта выходзіла дзяўчына з караваем і клала яго на «зарунелую ніву». Потым і ўвесь гурт карагодам абыходзіў свой каравай. Увесь гэты прыгожы і ўрачысты спеўны ланцужок закончыўся агульным заклінальным карагодам «Зарадзі, Божа, жыта... ». У канцы песні — юраўская замова на ўраджай, дабрабыт у сям'і і гаспадарцы. Амаль такую прамаўляў і гаспадар, калі дзяліў каравай, з якім разам са сваёй сям'ёй абыходзіў поле.

Святочнага настрою дадала яшчэ танцавальна-гульнёвая вечарына, якую зладзілі пасля юраўскага абраду гурты «Ветах», «Верас» і «Вяснянка». Нават і тыя, хто не ўмеў танчыць народныя танцы, мог досыць хутка навучыцца такім танцам, як «Кракавяк», «Падэспань», «Верабей». Вельмі цікава прайшла гульня «Цяцерка». Дзяўчаты, як аказалася, даволі спрытныя, дагнаць іх хлопцам было не так ужо й лёгка...

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ